Ня бойся!

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№13 (166), ЖНІВЕНЬ 2013 ГОДА

Цытата нумара:

Усё далей адыходзіць ад розума то, што адхіляецца ад закона і парадка

Платон, філосаф

МЯСЦОВАЕ САМАЎПРАЎСТВА

“НАПЛЯВАЦЬ” І НА ЭКОЛАГАЎ, І НА ПРАКУРАТУРУ

Кіраўнікі трох сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Гарадоччыны больш двух гадоў самаўпраўна карыстаюцца воднымі рэсурсамі Беларусі.

Памочнік пракурора раёна Ірына Тарасевіч на старонцы Гарадоцкай пракуратуры ў сеціве gorodok.vitebsk-region.gov.by/ru/vlast/prokuratura/news prokur распавяла аб ігнараванні кіраўнікамі трох сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Гарадоччыны патрабаванняў Воднага кодэксу Беларусі, Указа кіраўніка краіны “Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці”.

У прыватнасці было адзначана, што ў студзені гэтага года пракурор Гарадоцкага раёна вынес два прадпісанні **дырэктару КУСГП ім. Свярдлова В. Ігнацьевай.** У гэтых прадпісаннях было патрабаванне неадкладна прыняць належныя меры да ліквідацыі парушэнняў заканадаўства і атрымання ва ўстаноўленым парадку спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) **аб заборе вады для сельскагаспадарчых патрэб.** Таксама было неабходна неадкладна паведаміць аб выкананні прадпісанняў пракурору раёна.

Нягледзячы на абавязковасць неадкладнага выканання патрабаванняў і адсутнасць якіх-небудзь перашкод да іх выканання дырэктарам **Ігнацьевай В.М.** названыя прадпісанні да цяперашняга часу фактычна не выкананыя. Адпаведна, належных мер па атрыманні ва ўстаноўленым парадку спецыяльных дазволаў не зроблена.Пры тым, што тэрмін дзеяння адпаведнага дазволу скончыўся яшчэ 14.04.2011.

Таксама аналагічныя парушэнні былі дапушчаны в.а. дырэктара **КУСГП ім. Дзімітрава Усеваладавай Л.А. і в.а. дырэктара КУСГП «Сцяпанавічы» Раманавым У.В.** па забору вады для сельскагаспадарчых патрэб.

Ігнацьевай В.М., Усеваладавай Л.А. і Раманавым У.В. былі здзейснены адміністрацыйныя правапарушэнні, адказнасць за якія прадугледжана **арт. 23.1 Кодэкса Рэспублікі Беларусь** аб адміністрацыйных правапарушэннях. Гэта значыць, што за невыкананне выражанага ва ўстаноўленай заканадаўствам форме патрабавання службовай асобы, якая ажыццяўляе дзяржаўны нагляд, існуе адміністрацыйная адказнасць у накладанні штрафу ў памеры да 20 базавых велічынь.

У сувязі з учыненнем названымі кіраўнікамі адміністрацыйных правапарушэнняў, пракуратурай раёна тры кіраўніка прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

Акрамя таго, выкладзеныя вышэй парушэнні патрабаванняў Закона сведчаць аб неналежным узроўні выканальніцкай дысцыпліны, добрасумленнасці, пры выкананні службовых абавязкаў гэтых кіраўнікоў па віне якіх яны былі дапушчаныя.

Апошнія не належным чынам выканалі свае службовыя абавязкі, у сувязі з чым у адпаведнасці з **арт. 197 ПК Рэспублікі Беларусь у іх дзеяннях маюць месца дысцыплінарныя правіны.** Таму пракуратурай раёна ў адрас начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гарадоцкага райвыканкама Кавалёву У.І. ўнесена прадстаўленне, у якім, у тым ліку пастаўлена пытанне аб дысцыплінарнай адказнасці Ігнацьевай В.М., Усеваладавай Л.А. і Раманава У.В..

Цяжка ўявіць, што кіраўнікі прыватных арганізацый на працягу некалькіх гадоў маглі бы ігнараваць патрабаванні аб ліцэнзаванні сваёй дзейнасці і аддзелаваліся толькі штрафамі і дысцыплінарнымі пакараннямі. Дарэчы, пракуратура пачала выносіць папярэджанні пасля таго, як кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў **ігнаравалі прадпісанні мясцовых эколагаў.**

Л. Антонаў

ДАРОЖНЫ РУХ

ДАРОГА ПРЫДАТНАЯ ДЛЯ РАЛІ

Дарога каля базы ААТ “Гарадоцкі райаграпрамзаб” і да вуліц Праўды і Чарняхоўскага з кожным годам усё больш ператвараецца ў дарогу для ралі. Гэтым летам яе стан яшчэ больш пагоршыўся

Тое, што для нармальнага руху прыдатны з большага, толькі цэнтральныя вуліцы Гарадка даўно вядома мясцовым аўтааматарам. Вуліцы ж прыватнага сектару па вясне і восені становяцца небяспечнымі для руху пешаходаў і аўтатранспарта. Па гэтых вуліцах магчыма ездзіць толькі **як па прасёлачных дарогах – з хуткасцю 20-30 км.**

Не выключэннем з’яўляецца дарога каля **базы ААТ “Гарадоцкі райаграпрамзаб” і далей да вуліц Праўды і Чарняхоўскага.** Калісьці тут быў пракладзены асфальт, але зараз ён ледзь праглядаецца з-пад пяска і на ім ужо устойліва **расце трыпутнік.**

Яшчэ больш горшым стала становішча **з мастом і пад’ездам да яго** на гэтым участку дарогі. Моцныя дажджы **праклалі ручаі да маста,** а дарожныя службы не спяшаюцца засыпаць гэтыя ямы ля маста. Ды і на самім масту ўжо **ўтварылася дзірка** у якую можа ўскочыць кола аўтамабіля. **Поручняў з аднаго боку** маста няма ўжо больш дзесяцігоддзя.

Недарэчным выглядаюць і астаткі асфальта пры **руху да завулкаў Чарняхоўскага,** якія хутка будуць канчаткова перашкаджаць праязджаць далей. Дажджы вакол астаткаў асфальта пракладваюць усё глыбейшыя ручаі.

Гарадоцкаму райвыканкаму, які увесь час скардзіцца на недахоп сродкаў, застаецца **прапанаваць правесці раллі ў Гарадку** па мясцоваму бездарожжу, а на атрыманыя грошы для пачатку засыпацьямы і калдобіны гравіем. Ды і не “забывацца” сваечасова грэдзіраваць вуліцы райцэнтра.

П.С. Фотарэпартаж з дарогі ад 18 жніўня магчыма паглядзець на сайце http://haradok.info

Л. Антонаў

ФІНАНСАВЫЯ ПРАБЛЕМЫ

ЧОРНЫ ЧЭРВЕНЬ АБО ХУТКІ РУХ У МІНУС

Прадпрыемствы Гарадоччыны першае паўгоддзе завяршылі са шматмільярднымі стратамі ад сваёй дзейнасці. Гарадоцкі раён апынуўся сярод васьмі раёнаў Беларусі, якія спрацавалі са стратамі.

Нацыянальны статкамітэт апублікаваў даныя асноўных паказчыкаў развіцця абласцей і раёнаў Беларусі за першае паўгоддзе. Гэтыя даныя сведчаць, што прамысловасць і сельская гаспадарка раёна працуе са стратамі, маючы адмоўную рэнтабельнасць ад продажы сваёй прадукцыі. Пры гэтым адмоўная тэндэнцыя ў гаспадарчай дзейнасці значна ўзмацнілася менавіта ў апошні месяц першага паўгоддзя. Калі па выніках пяці месяцаў страты ад дзейнасці арганізацый раёна склалі 1, 3 млрд. рублёў, то за ўсё першае паўгоддзе аж 6,2 млрд. рублёў – рост стратаў за месяц склаў амаль пяць мільярдаў рублёў.

Адпаведна Гарадоцкі раёнаў апынуўся сярод васьмёркі банкрутных раёнаў краіны: Ганцавіцкага, Маларыцкага, Глыбоцкага, Мёрскага, Буда-Кашалёўскага, Светлагорскага, Крычаўскага. І гэта пры тым, што год назад стратных раёнаў было толькі тры.

Адпаведна пагоршылася і фінансавае становішча прадпрыемстваў, калі яны ніяк не могуць атрымаць грошы за пастаўленую прадукцыю: дэбіторская пратэрмінаваная запазычанасць вырасла да 18 445 млн. руб. – рост за месяц на два мільярды; крэдыторская пратэрмінаваная запазычанасць перайшла ста мільярдную мяжу і склала амаль 109 мільярдаў рублёў – прырост больш 11 мільярдаў. Пры гэтым запазычанасць за пратэрміноўку па крэдытах і пазыках арганізацый раёна вырасла за месяц яшчэ на чатыры мільярды і дасягнула 17146 млн. рублёў.

Адчуваецца, што кіраўніцтва раёна імкнецца запрасіць “Дажынкі-2014” у Гарадок пад арыгінальным дэвізам: “Прыязджайце вучыцца, як не трэба кіраваць”. Толькі ці будзе гэта галоўным крытэрам пры вырашэнні пытання аб месцы свята хлебаробаў у 2014 годзе – вялікае пытанне. Хаця з іншага боку, само кіраўніцтва краіны паказвае беларусам і свету, як не трэба кіраваць. То і на Гарадок можа выпасць мазь...

Леанід Гаравы

ДЭМАГРАФІЧНАЯ ЯМА

ЗНІКНЕННЕ СЕЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ

З пачатку стагоддзя больш чым на палову скарацілася колькасць вучняў у школах Гарадоччыны, а з 35 школ розных відаў засталося толькі 16.

На пачатку 21 стагоддзя у 2001 годзе на Гарадоччыне дзейнічала **7 пачатковых школ, 11 базавых і 17 сярэдніх школ** у якіх навучалася больш **чатырох з паловай тысяч вучняў.** Адных толькі класаў-камплектаў у пачатковым звяне сістэмы адукацыі раёна было 128.

У новы навучальны год на Гарадоччыне запросяць вучняў ужо толькі **11 сярэдніх і 5 базавых** школ розных тыпаў навучання, а за парты сядуць толькі **2129 вучняў,** з якіх толькі 202 першакласніка. Пры гэтым у школы Гарадка ў першы клас пойдуць **128 дзетак,** а ў 14 сельскіх школах будзе 74 вучня. Дакладней, у 12 сельскіх, бо у **Халамерскай і Вышадскіх** школах па прагнозах аддзела адукацыі ў першы клас няма каму ісці.

У гэтым навучальным годзе не будзе закрыцця сельскіх школ у раёне, але адбудзецца іх **рэарганізацыя.** З катэгорыі сярэдняя ў базавую будуць пераведзены школы ў вёсках **Стадолішча і Вайханы.** Так будзе зроблена па планах абласнога упраўлення адукацыі яшчэ з 44 школамі Віцебшчыны, а 24 школы ў сельскай мясцовасці будуць закрыты.

Л. Антонаў

ТЭЛЕБАЧАННЕ

ЛЯМПАВЫЯ ТЭЛЕВІЗАРЫ ПРАЦАВАЦЬ НЕ БУДУЦЬ

На тэрыторыі Гарадоцкага раёна адключэнне аналагавага тэлебачання з н.п. Бычыха будзе зроблена ў апошнюю чаргу.

Да 17 чэрвеня 2015 года па краіне будзе спынена вяшчанне **аналагавага тэлебачання** і застанецца сучасны лічбавы фармат. Адпаведна графіка спынення аналавага тэлевяшчання першым на Вітцебшчыне гэта адчуюць жыхары Шаркаўшчыны, дзе спыненне адбудзецца **з 1 красавіка 2014 года.** Потым з **15 мая адключаць у Віцебску і ў гэту зону трапляе значная частка Гарадоцкага раёна**, а з 1 жніўня - у н.п. Абухава (Аршанскі раён).

У Гарадоцкім раёне, як і ў Браслаўскім адключэнне аналагавага тэлевяшчання адбудзецца у апошні тэрмін -- **15 мая 2015 года.**

На тэрыторыі Віцебскай вобласці ў цяперашні час магчымы прыём сігналаў **лічбавага вяшчання** ад 12 лічбавых тэлевізійных перадатчыкаў, размешчаных у розных населеных пунктах у тым ліку і **н.п. Бычыха Гарадоцкага раёна,** адкуль адбываецца вяшчанне 43 каналаў на адлегласці 27 км.

Па стане на 8 ліпеня 2013 года ахоп насельніцтва рэспублікі лічбавым тэлевізійным вяшчаннем стандарту DVB-T складае 96,07%, у тым ліку ў Віцебскай вобласці - 88,7%.

Т. Гаражанка

МЕРКАВАННЕ

«А ЯШЧЭ ПАСЛУ СУРЫКАВУ ВАРТА БЫЛО Б ШКОНКУ ВЫДЗЕЛІЦЬ»

Адзін чалавек, якога шкада ва ўсёй гэтай гісторыі з гендырэктарам «Уралкалія» — маці Уладзіслава Баўмгертнера. Раптоўны арышт у дзікай краіне цалкам паспяховага і шчаслівага сына.

Немаладая жанчына імчыцца ў Мінск, каб яго тэрмінова ўбачыць, але не тое што ўбачыць — не можа перадаць у камеру нават самыя простыя рэчы: майткі, шкарпэткі, швэдар…

Яна блукае пад сценамі беларускага КДБ, таму што так здаецца, што скрозь тоўстыя сцены яе хлопчык усё ж адчуе родную душу. Яна з надзеяй глядзіць у абыякавыя вокны ведамства нашчадкаў Дзяржынскага, быццам за 85 апошніх гадоў у іх хто-небудзь бачыў што-небудзь добрае.

Яна гатовая гадзінамі аб адным і тым жа распытваць адваката, таму што ён адзіны доказ, што сын наогул жывы…

Колькі раз гэта было! Колькі беларускіх маці не маглі зразумець: за што? Колькі іх задаваліся пытаннем: «Як жа такое можа быць? Бо гэта Еўропа, 21 стагоддзе? Адкуль такое дзікунства?»

Баўмгертнера мне не шкада. І Керымава добра б у суседнюю камеру пасадзіць. І Валошына. Таму што яны выдатна ведалі, з кім вядуць бізнэс. Больш за тое, яны рваліся сюды менавіта таму, што ў Беларусі магчымы шахер-махер, няма законаў, гульня ідзе без правілаў. Падарыў прэзідэнту " Майбах « — і адразу ўсё дазволена.

А яшчэ паслу Расіі Сурыкаву варта было б шконку выдзеліць. Разам з расійскім МЗС, дэпутатамі Дзярждумы і многімі-многімі, хто ў Маскве са штаноў выскокваў, расхвальваючы беларускія парадкі.

Колькі разоў мы ад іх чулі, што Беларусь — прававая дэмакратычная дзяржава, якую Захад падвяргае несправядлівым нападкам. Колькі разоў яны пераконвалі і свет, і нас, і сябе, што ўсё выдатна ў Беларусі з правамі чалавека. Што добры у Беларусі прэзідэнт і іншы нам не патрэбны.

Практычна ўсе кандыдаты ў прэзідэнты на апошніх выбарах былі арыштаваныя, але Расія павіншавала Лукашэнку з сумленнай перамогай і стала сцяной на яго абарону на міжнароднай арэне.

Адвакатаў да арыштаваных не дапускалі, лісты і перадачы не дазвалялі — расійскі МЗС казаў пра нацыянальныя асаблівасці дэмакратыі.

Калі ўвесь цывілізаваны свет патрабаваў вызвалення беларускіх палітвязняў, Расія паўтарала: «Ёсць суд, усё будзе па законе».

Што ж гэта сёння яны не ўспамінаюць пра справядлівы беларускі суд, які наўвінных не асудзіць? Што ж цяпер проста супрацьлеглае кажуць: «Сярэднявечча, дзікунства, выпусціце неадкладна…»

А калі кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева збілі да непрытомнасці яшчэ да закрыцця выбарчых участкаў; калі яго выцягнулі на коўдрах проста з бальнічнай палаты і завалаклі ў СІЗА, гэта не было дзікасцю і Сярэднявеччам? .

Доўга ўжо кіруе Лукашэнкі з расійскай дапамогай і прыкладаў можна прыводзіць шмат. Таму будзе справядліва і правільна, каб кожнага, хто спадзяваўся або спадзяецца злавіць нешта ў беларускіх каламутных водах, дамовіўшыся асабіста з Лукашэнкам, спасцігаў лёс Баўмгертнера — камера ў «амерыканцы».

Незалежна ад таго, з Расіі гэтыя партнёры — адвакаты-прыхільнікі, з ЗША ці з Гвадэлупы. Таму што з добрымі намерамі сумленнага бізнесу ў цяперашнія беларускія ўмовы ніхто не пойдзе.

Прыязджайце! Welcome! Пераканайцеся, што ў камерах бедненька, але чысценька! І што першымі аб'ектамі, якія трэба было ў нас прыватызаваць, перш чым будаваць нейкія планы, з'яўляюцца беларускія турмы.

Вось толькі маці шкада… Яны пакутуюць аднолькава — і мамы мільярдэраў, якія спявалі хвалебныя оды цяперашнім беларускім парадкам, і мамы жабракоў студэнтаў, якія ненавідзяць гэтыя парадкі да адчайнай неразважлівасці.

Святлана Калінкіна
«Народная воля»

ТАКІЯ ПАПРАЎКІ…

ЛЕАНІД АЎТУХОЎ ЗАКЛІКАЎ ДЭПУТАТАЎ ДА АДКАЗНАСЬЦІ

Старшыня Віцебскай абласной рады партыі БНФ Леанід Аўтухоў зьвярнуўся ў Камісію па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў наконт разгляду паправак ў Выбарчы і Адміністрацыйны кодэксы Рэспублікі Беларусь.

Паводле зьвестак, распаўсюджаных у СМІ, на чарговай сэсіі дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь будуць разгледжаны **папраўкі ў Выбарчы і Адміністрацыйны кодэксы** Рэспублікі Беларусь. Згодна з наяўнай інфармацыяй, будзе забароненая агітацыя за байкот выбараў, а за ажыццяўленне такой агітацыі будуць прадугледжаны адміністрацыйныя санкцыі.

На думку партыйнага лідэра, у выпадку прыняцьця вышэйзгаданых зьменаў будзе створаная заканадаўчая база для наўпроставага парушэння грамадзянскіх і палітычных правоў грамадзян, а менавіта права на свабоднае выказванне імі свайго меркаваньня. Сфэра гэтага права распаўсюджваецца і на права публічна заклікаць да байкоту выбараў.

Таксама **Леанід Аўтухоў** адзначае, што свабоднае волевыяўленне грамадзян – гэта асноўны прынцып дэмакратычных выбараў. Паколькі ў беларускім выбарчым заканадаўстве адсутнічае прынцып абавязковага галасаваньня, дык выбаршчык на ўласны одум мае праве альбо браць удзел у галасаванні, альбо яго байкатаваць. У выпадку ж прыняцьця згаданых паправак прыхільнікі байкоту будуць пастаўленыя ў няроўныя ўмовы.

«Як агітацыя да ўдзелу ў галасаваньні, гэтак і агітацыя да байкоту галасаваньня, маюць роўныя прававыя перадумовы быць рэалізаванымі ўсімі ўдзельнікамі выбарчага працэсу. Калі ж у беларускім заканадаўстве зьвіцца адміністрацыйнае пакараньне за агітацыю байкатаваць выбары, то выканаўчая ўлада займее дадатковы рычаг забесьпячэньня яўкі грамадзян на выбарчыя ўчасткі. Бо няяўку для галасаваньня можна лёгка трактаваць як "агітацыю за байкот выбараў" і, запалохваючы выбаршчыкаў наяўнасьцю адміністрацыйнага пакараньня, прымушаць іх да галасаваньня. Прычым і тых, хто сьвядома жадаюць удзельнічаць у байкоце выбараў», – тлумачыць Леанід Аўтухоў сваю пазыцыю.

У сваім звароце да ПП НС РБ партыйны лідэр заклікаў іх адказна паставіцца да прапанаваных паправак у ВК РБ і КаАП РБ і **перашкодзіць унясенью** ў вышэйзгаданыя кодэксы палажэньняў, якія будуць **наўпрост парушаць правы і законныя інтарэсы грамадзян - беларускіх выбаршчыкаў.**

vitebskspring.org

ДАРОЖНЫ РУХ

"ЛЯЖАЧЫЯ ПАЛІЦЭЙСКІЯ" ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА ПАФАРБАВАЛІ

У Гарадку 23 жніўня завяршылася афарбоўка "ляжачых паліцэйскіх" і нанясенне надпісаў "школа". Але самі "паліцэйскія" не адпавядаюць дзяржаўным стандартам.

Апошнія надпісы **"школа"** ўпершыню былі нанесены каля будынка пачатковых класаў па **вул. К. Маркса,** што размяшчаецца далей Гарадоцкага аддзялення "Белдзяржстраха". Гэтыя надпісы з'явіліся перад самымі "крутымі" "ляжачымі паліцэйскімі" у Гарадку.

Перад гэтым падобныя надпісы з'явіліся і перад іншымі навучальнымі установамі Гарадка – сярэднімі школамі па вул. Пралетарская і Невельская шаша, а таксама перад Дзіцячай школай мастацтваў па вул. Ленінская. Гэтыя надпісы заклікаюць павысіць пільнасць кіроўцаў каля навучальных устаноў.

Між тым самі **"ляжачыя паліцэйскія"**, усталяваныя ў Гарадку на **вул. К. Маркса і Ленінская** не адпавядаюць патрабаванням **СТБ 1538-2005 «Штучныя няроўнасці на аўтамабільных дарогах і вуліцах. Тэхнічныя патрабаванні і правілы прымянення».** Па гэтых патрабаванняў іх максімальная вышыня павінна быць не болей 65 мм, а шырыня ад метра да трох з паловай метра.

Такі правільныя "паліцэйскі" ўсталяваны толькі **каля Гарадоцкага агратэхнічнага каледжа**, што дазваляе аўтаматарам пераадольваць без праблем для падвескі на хуткасці 20-30 км/г. Усе астатнія "паліцэйскія" выраблены гарадоцкімі дарожнікамі без захавання патрабаванняў стандартаў.

Між тым, даследаваннямі выяўлена, што рух на хуткасці 5-10 км/г прыводзіць да дадатковых выкідаў у атмасферу шкодных рэчаў згарання паліва. У цывілізаваных краінах, дамы, каля якіх ёсць **"ляжачыя паліцэйскія" маюць меншы рынкавы кошт менавіта ў сувязі з гэтай экалагічнай праблемай.** І гэта пры тым, што там няма "ляжачых паліцэйскіх" у выглядзе бугроў, як у Гарадку і ў іншых беларускіх гарадах.

Зараз толькі ад **Гарадоцкай службы ДАІ** залежыць, як хутка дарожнікі выправяць свае хібы па ўсталяванню "ляжачых паліцэйскіх".

Л. Антонаў

ЗДАРЭННІ

ДОМ ЗГАРЭЎ, А ПОПЕЛ ЗАСТАЎСЯ…

15 жніўня ў в Канавалава адбыўся пажар, а аб'ектам гарэння стаў жылы драўляны дом. Увечары 15 жніўня ў 18.00 гаспадар дома затапіў ацяпляльна - варачную печ. У 21.00 ён заўважыў, што ў раёне столевага перакрыцця бачны белы дым, непасрэдна каля самой печы. Гаспадар пакінуў печ адкрытай і пайшоў начаваць да суседзяў, так як дома начаваць пабаяўся. «А раптам учадзю» - распавядае гаспадар. У выніку ў 23.10 яму паведамілі, што дом цалкам ахоплены агнём.

Пажарныя Гарадоцкага РАНС аператыўна прыбылі да месца пажару, але ратаваць ужо не было чаго. У выніку пажару ніхто і маёмасць, якое знаходзілася ў ім, цалкам пашкоджаны.

Шкода ад пажару склаў каля 15 млн. беларускіх рублёў.

ЎНУЧКА ПРАПАЛІЛА ЛАЗНЮ…

18 жніўня ў в Кабішча адбыўся пажар. Аб'ектам гарэння на гэты раз стала лазня і зблакаваўшыся з ёй гараж. Пажар узнік у выніку парушэння эксплуатацыі пячнога ацяплення. З-за адсутнасці дзверцы топкі, вуглі выпалі на драўляную краты перад печкай, у выніку чаго ўзнікла гарэнне.

Дадзены пажар былі ліквідаваны ў самыя кароткія тэрміны. У выніку пажару пашкоджаны перакрыцце, дах лазні і гаража, зблакаваўшыся з дадзенай лазняй.

У выніку гэтага здарэння ахвяраў няма. Шкода ад пажару склала 15 млн. беларускіх рублёў.

Т. Гаражанка

Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

КАЛІЙНАЕ ПЫТАННЕ

ФРАНКЕНШТЕЙН. БЕЛОРУССКИЙ ВАРИАНТ

Беспрецедентный - такое определение часто звучало вчера в связи с арестом гендиректора «Уралкалия» Владислава Баумгертнера. И с этим не поспоришь. Использовать встречу с премьер-министром в качестве «наживки», дабы заманить подозреваемого на свою территорию - это беспрецедентно. И невозможно ни в одной нормальной стране

В любой нормальной стране Мясникович уже через полчаса с момента, когда на лентах информагенств появилось сообщение о аресте его гостя, объяснялся бы со СМИ. И по результатам этих объяснений либо сам писал заявление об отставке, либо снимал бы руководство спецслужб, которое допустило, чтобы глава правительства вел переговоры с человеком, подозреваемым в совершении серьезных преступлений.

У нас не наступило ни того, ни другого. У нас все по особому. Ибо кто такой Мясникович? Формально второе лицо в государстве? Не смешите. И ребенок знает, кто у нас главный, а остальные так - статисты и писарчуки.

А какой у статиста может быть имидж? Ему сказали - он сделал. И все довольны.

Поэтому не будем о Мясниковиче.

За свою долгую полити-ческую жизнь Александр Лукашенко многократно шел «ва-банк», и все привыкли, что у него всегда все получается. А даже если не получается, то услужливый агитпроп путем длительной и безжалостной атаки на умы сограждан убедит всех, что Александр Григорьевич в очередной раз разложил на лопатки весь мир.

Поэтому большинство не сомневается, кто выйдет победителем из очередной схватки.

Тем временем ситуация сложилась достаточно однозначная.

Один из влиятельных российских бизнесменов был завлечен на территорию союзнического государства. Провел переговоры с его властями, а когда их результаты неудовлетворилипринимающую сторону,былarестованиобвинен в совершении преступления.

Если бы договорились, никто никого бы не арестовывал. Не договорились. Арестовали.

И как не крути, а арест руководителя компании, которая только за 2012 год заработала 3 950 млн. долларов, - это удар по российским интересам и однозначный вызов Кремлю.

Однако Россию не жалко. Она поддерживала Лукашенко вот уже 19 лет. Когда его власть шаталась, Кремль всегда протягивал ему руку помощи. Политик Лукашенко и созданная им политическая система - это во многом российский продукт.

И сейчас этот продукт дал звучную пощечину своему создателю. Сюжет прямо, как у Мэри Шэлли.

«Урри, Урри, где у него кнопка?» - вопрошал извест-ный персонаж популярного фильма из моего детства. Нечто подобное сейчас думают и в Кремле.

Так есть ли у Лукашенко кнопка? И знает ли Владимир Путин, где она находится? Или все наоборот. И это Лукашенко и его силовые структуры как раз сейчас нащупывают эту самую кнопку у Кремля?

Ответ на эти и другие вопросы мы получим уже скоро.

А пока Следственный Комитет учится безошибочно склонять фамилию Баумгертнер, сам господин Баумгертнер знакомится с особенностями белорусской пенитенциарной системы, а господин Мясникович готовится к новым встречам.

Ему еще со столькими надо встретиться!

Анджей Почобут

ПАЛІТЫЧНЫ ВЯЗЕНЬ

ЗМІЦЕР ДАШКЕВІЧ: НЕ КАЛЫМА — І ДЗЯКУЙ БОГУ

Па вызваленні 28 жніўня з гарадзенскай турмы Зміцер Дашкевіч адказаў на некалькі пытанняў журналістаў.

— Якія самыя цяжкія моманты былі за час зняволення?

— Якія самыя цяжкія? (усміхаецца). Самыя складаныя, калі два кешары па этапу цягнеш, а так усё проста.

— Ці змяніла Вас турма?

— Трэба, каб людзі паглядзелі ды ацанілі. Я ж не магу сябе сам ацаніць. Я б хацеў усім падзякаваць за падтрымку, за лісты, за малітвы. Гэта самае важнае для чалавека, які знаходзіцца ў турме.

— Ці лёгка было вытрымаць той ціск, што аказваўся на Вас у турме?

— Усё адносна. Цяжка не цяжка. Ведаеце, не так яно, каб і проста, але і не Калыма. Ну і дзякуй Богу.

— Не зламалі Вас?

— Я збіраюся займацца тым жа, чым займаўся. Буду рабіць тое, што рабіў да турмы.

— Вы ж ведаеце, што шмат людзей з'ехала з краіны.

— Я нікуды не еду.

— Якое было стаўленне іншых вязняў?

— Заўсёды і ўсюды вельмі добра падтрымлівалі. У некаторых месцах былі такія спробы адміністрацыі выкарыстоўваць зняволеных, каб яны нешта ажыццяўлялі. У турме заўсёды знойдуцца людзі, якія гатовыя зарабіць сабе ўмоўна-датэрміновае. Я іх разумею, калі 20–25 гадоў тэрмін, то будуць рабіць усё, што скажа адміністрацыя. Хаця нават у адміністрацыі ёсць розныя людзі, ёсць тыя, што чытаюць незалежныя СМІ. Нехта мог словам падтрымаць, нехта заварыць гарбаткі, нехта яблык. Я не магу сказаць, хто гэтыя людзі. Але будзе час, што скажу.

"Наша Ніва"

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

СУД У ЧАРГОВЫ РАЗ АДМОВІЎСЯ РАЗГЛЯДАЦЬ СКАРГУ

Калегія па грамадзянскіх справах Мінскага гарадскога суда разгледзела прыватную скаргу Любові Кавалёвай і Таццяны Казяр – родных расстралянага Уладзіслава Кавалёва, абвінавачанага ў здзяйсненні тэракту ў метро Мінска.

Родныя Кавалёва абскарджвалі адмову суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ва ўзбуджэнні грамадзянскай справы па іх скарзе на адмову прадаставіць інфармацыю пра месца пахавання Уладзіслава.

Калегія пакінула без задавальнення прыватную скаргу Любові Кавалёвай і Таццяны Казяр. Суддзя Аксана Будоўская пагадзілася з высновамі суда Кастрычніцкага раёна Мінска аб тым, што разгляд дадзенага звароту не падведамасны агульным судам Беларусі.

Па словах адваката Кавалёвай і Казяр Сяргея Галубка, у дадзеным выпадку парушана канстытуцыйнае права кожнага на судовую абарону. Адвакат таксама адзначыў, што ў чарговы раз беларускія суды падцвердзілі сваё нежаданне выконваць рашэнне Камітэта па правах чалавека – органа, прадугледжанага Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, міжнароднай дамовы, якую Беларусь ратыфікавала і абавязалася выконваць.

Паводле адваката, рашэнне будзе абскарджана ў наглядным парадку, а таксама будуць прыняты меры на міжнародным узроўні, каб дабіцца выканання рашэння Камітэта па правах чалавека ААН, і каб родныя даведаліся праўду пра месца пахавання сына і брата.

Скарга Любові Кавалёвай і Таццяны Казяр па справе Уладзіслава Кавалёва была разгледжана Камітэтам па правах чалавека ААН. Камітэт прызнаў, што было парушана права на жыццё і прызнаў парушэнне права на атрыманне цела забітага сваяка і інфармацыі пра час і месца ягонага пахавання.

http://spring96.org/be/news/65430

НАША ЎЛАДА

КОЛЬКІ САЛДАТ Ў ЛУКАШЭНКІ?

З грашыма ўсё горш, і таму уладам Беларусі давядзецца эканоміць нават на арміі. Такая, калі зняць камуфляж, пападлёка нарады па пытаннях узброеных сіл, якое Аляксандр Лукашэнка правёў 20 жніўня.

У прыватнасці, прэзідэнт і галоўнакамандуючы заявіў, што варта працягнуць працу па аптымізацыі структуры і скарачэнні колькасці ўзброеных сіл.

Войска будуць скарачаць і далей

Пры гэтым прагучала, што цяпер у складзе ўзброеных сіл - каля ста тысяч чалавек. Лічба выклікала здзіўленне ў нашых ваенных экспертаў. Так, Аляксандр Алесін у каментары для Naviny.by палічыў яе звычайнай для беларускага афіцыйнага лідэра гіпербала. На самай справе колькасць айчыннага войскі даўно зрэзалі ніжэй гэтага паказчыка.

Па дадзеных іншага суразмоўцы Naviny.by - кіраўніка аналітычнага праекта Belarus Security Blog Андрэя Паротнікава, сёння штатная колькасць беларускіх нд - 48 тысяч ваеннаслужачых і 12 тысяч асоб грамадзянскага персаналу, рэальная ж яшчэ менш за кошт некамплекту.

Паротнікаў шкадуе, што гаворка ідзе не аб рэфармаванні арміі, а аб далейшым банальным скарачэнні, пры тым што «часы скарачэнняў прайшлі, і ўжо даўно проста няма чаго скарачаць». Прычына ж такога прымітыўнага падыходу, як мяркуе эксперт, празаічная: «Грошай няма і не прадбачыцца".

Пры гэтым аналітык не згодны, што на забеспячэнне абараназдольнасці няма рэсурсу: велізарныя сродкі, у прыватнасці, былі патрачаны на леташнія «Дажынкі» ў Горках і яшчэ невядома колькі прыйдзецца выдаткаваць на рамонт таго, што там усё пасыпалася. «Беларусь у стане сябе абараніць, і грошы ў краіне ёсць, пытанне ў прыярытэтах і эфектыўнасці расходавання сродкаў», - рэзюмуе Паротнікаў.

На табе, нябожа, што нам не гожа!

І ўсё ж больш падобна на тое, што беларускія фінансы прыпадабняюцца Трышкіну каптану. Улада ліхаманкава мяркуе, што б каму сплавіць. Вось адзін з сімптомаў: на нарадзе Лукашэнка загадаў прадаваць лішкі прадукцыі ваеннага прызначэння, «якія нам у прынцыпе не патрэбныя ў сувязі з тым, што ідзе мадэрнізацыя узброеных сілаў». Карацей, на табе, нябожа, што нам ня гожа! «Падобна на тое, што гэта пошук грошай ужо не толькі для войска, але і ў прынцыпе для бюджэту», - мяркуе Алесін.

Аднак на гэтай справе Мінск відавочна шмат не наварыць. Залатыя часы распродажы велізарных запасаў савецкага ўзбраення прайшлі. Рэшткі невялікія, да таго ж іх трэба прыводзіць у таварны выгляд, ды і пакваліцца на такое дабро могуць хіба што адсталыя рэжымы трэцяга свету, у якіх у кішэнях, як правіла, гуляе вецер.

Рэальна сякі-такі даход можа даць продаж бамбавікоў Су-24, знішчальнікаў Су-27, кажа Алесін. Астатняе - існая дробязь, «тандэт» дадае эксперт: «З-за пары дзіравых танкаў і БРДМаў, за якія выручыш нават не сотні, а толькі дзесяткі тысяч даляраў, няма сэнсу пэцкацца».

Што ж тычыцца самалётаў, то, па грубым прыкідках, можна наскрэбці на продаж тузін, а то і больш састарэлых, распрацаваных ў СССР яшчэ ў 60-х гадах Су-24. Таксама ў мінулым годзе былі выведзены з эксплуатацыі ў айчынных ВПС 14 Су-27. Іх можна адрамантаваць і мадэрнізаваць на авіярамонтным заводзе ў Баранавічах. Але гэта таксама затраты. У выніку ж за Су-27 атрымаецца выбавіць максімум па 5-7 мільёнаў даляраў, Су-24 давядзецца прадаваць яшчэ танней, мяркуе Алесін...

Чужыя базы - як стрэмкі

Але чым далей, тым складаней вырашаць з Расіяй пытанні такім саматужным спосабам. Масква таго і глядзі прыбярэ да рук і сам МКЗТ. Тым больш не наскрэбці грошай на куплю сучасных баявых самалётаў. І наогул, мадэрнізацыя беларускага войска - пад вялікім пытаннем. Памятаеце «Вяселле ў Малінаўцы»: «У пана атамана няма залатога запасу».

Тым часам, як бачым, расейцы вырашаюць пытанне «абароны саюзных межаў» у фірмовым стылі - прыходзяць на беларускую зямлю са сваёй зброяй. Абяцаннямі даць С-300 кормяць які год, а вось месца для сваёй авіябазы пад бокам у НАТА падабралі ў дзіўнай спрытнасці.

Прадбачу рэпліку: а што тут такога, бо і натаўскія суседзі Беларусі выкарыстоўваюць для сваёй абароны замежную авіяцыю! Сапраўды, неба Балтыі патрулююць знішчальнікі іншых краін альянсу, Польшча размяшчае ў сябе амерыканскія F-16.

Розніца, аднак, у тым, што ў стасунках Расеі з Беларуссю - цяжкі імпэрскі бэкграўнд.

І не толькі з Беларуссю. Успомніце вайну з Грузіяй. Пагалядзіце, як прэсінгуюць сёння накіраваную на еўрапейскую інтэграцыю Украіну.

Тэрыторыю ж на захад ад Смаленска Масква традыцыйна разглядае як свой стратэгічны плацдарм. Незалежнасць «сінявокай малодшай сястры" амаль усім пагалоўна у расійскіх элітах уяўляецца гістарычным непаразуменнем.

І калі калі-небудзь Беларусь абярэ іншы шлях развіцця, то ваенныя аб'екты ўсходняй суседкі могуць стацца ў гнілую стрэмку. *(скарочана)*

Аляксандр Класкоўскі

Чытаць цалкам: naviny.by

НАША КУЛЬТУРА

ГУТАРКА З УЛАДЗІМІРАМ АРЛОВЫМ: МАЯ ДОЛЯ НЕЎМІРУЧАСЦІ

25 жніўня пісьменніку і гісторыку споўнілася 60 гадоў. Напярэдадні ён адказаў на некалькі пытанняў «Нашай Нівы».

«Наша Ніва»: Ці будзеце Вы адзначаць 60-годдзе? Увогуле, у Вас прынята адзначаць дні нараджэння? Калі так, то мо ўзгадаеце самы памятны з іх і самы памятны падарунак

Уладзімір Арлоў: Зрабіць выгляд, быццам нічога не здарылася, было б не зусім па-мужчынску. Прыход на свет — галоўная падзея жыцця. Цяжка не пагадзіцца з Платонам: нараджэнне ёсць той доляй неўміручасці і вечнасці, якая дадзеная смяротнай істоце.

Мне даводзілася сустракаць гэты дзень і на самоце, і ў вандроўцы далёка ад дому, але я ніколі не забываў яго адзначыць — хаця б няспешнай размовай з самім сабой.

З гадамі чалавек нібыта ўсё бліжэйшы да багоў, герояў і дэманаў, і людзі цікавяць яго ўсё менш. Пакуль што не магу сказаць тое пра сябе. Прынамсі, людзі працягваюць цікавіць мяне, і некаторых з іх я хачу абавязкова ў апошнія жнівеньскія дні ўбачыць.

Дадам, што з 2008 я адзначаю і другі свой дзень нараджэння — 6 лістапада. Тады я — ужо з інфарктам і тромбам, што затаіўся ў адной з артэрыяў — нейкім дзівам даляцеў з Лондана, дзе быў на канферэнцыі і, дарэчы, выступаў на тэму "Сыход паэта з яснай явы. Версіі Купалавай смерці", і ў Мінску адразу трапіў у рэанімацыю. Кардыяхірург Алег Паланецкі вярнуў мне адабраны рэаніматолагамі тэлефон і даў дзесяць хвілін да пачатку тэрміновай аперацыі. Па дарозе ў аперацыйную, я думаў, што, калі сёння ўсё скончыцца тут, даведаюся, што дзеецца там. Не вельмі, прызнаюся, такая думка суцяшала, але літарацкі інстынкт, тым не менш, прымушаў запамінаць усе дэталі.

У Віславы Шымборскай ёсць пераствораны Андрэем Хадановічам верш «Заўтра без нас»:

...Наступны дзень
абяцае быць сонечным,
хоць тым, хто будзе жыць далей,
яшчэ спатрэбіцца парасон.

Як бачыце, парасон мне дагэтуль патрэбны...

«НН»: Я ведаю, што кожнае лета Вы выпраўляецеся на беларускія выспы. Чаму на іх, а не на Мальту, Кіпр ці Тэнэрыфе?

УА: Выспа павінна быць бязлюднай. Тады, калі высаджваецца нашая сябрына, там — няхай усяго на пару дзён — утвараецца свой, заўсёды непаўторны свет, у якім мы ўсе разам сапраўды ляцім да зор.

Я бываў на Кіпры, але на Асвейскай выспе, далібог, спадабалася больш (між іншага, гэта адзіная ў нас месца, дзе здараецца фата-маргана) Хіба ў Ларнацы або Лімасоле да вас прыйдзе знаёміцца сям'я ваўкоў? А тамтэйшыя вялізныя здзічэлыя сады! Калісьці з выспы выселілі на бераг цэлую вёску — каб нарэшце ўсталяваць у ёй савецкую ўладу. Але засталіся сады, падмуркі, магілы. І, вядома, душы былых астраўлянаў. Мне там увесь час прыходзілі на памяць «Марсіянскія хронікі» Рэя Брэдберы. Мо і з тае прычыны, што якраз пад час нашага падарожжа адбылося амаль поўнае зацменне Месяца. Ноч пасля зрабілася такой светлаю, што я а другой гадзіне чытаў на беразе свежы нумар "Arche".

«НН»: Раней Вы казалі, што твор «Незалежнасць — гэта…» самы папулярны сярод тых, што просяць прачытаць на сустрэчах. А Вы лічыце, што незалежнасць — гэта ўжо назаўсёды, ці яе трэба працягваць пільнаваць?

УА: Незалежнасць — гэта назаўсёды найвялікшая каштоўнасць для нацыі, бо без яе нацыя не здольная выканаць сваю гістарычную місію ці, калі хочаце, Божае наканаванне. Ад нашай жа незалежнасці кожны дзень адшчыкваюць па драбку, а часам і адгрызаюць цэлы шмат.

Незалежнасці не будзе без гістарычнай памяці, а цяперашняя ўлада будуе «лінію Сталіна» ды яе філіялы, не «плануючы» ставіць помнік Каліноўскаму. Незалежнасці не будзе без мовы, а няўхільна скарачаецца беларускамоўнае навучанне. Я выдатна разумею, што Беларусь ніколі не была і не бу-дзе моналінгвістычнай, гэтаксама як не была і не будзе монакультурнай і монаканфесійнай. Але ж мы ёсць сведкамі штодзённай дыскрымінацыі менавіта мовы тытульнай нацыі.

Днямі тэлефаную ў даведку ў аэрапорт, і з таго боку дзяўчо зусім не агрэсіўна, а разгублена просіць гаварыць па-руску, бо баіцца нешта няправільна адказаць: не ведае, што за месяцы жнівень і верасень, перапытвае пра нядзелю. І раптам пачынае прабачацца: а дзе яна магла вывучыць мову, калі школа руская, радыё па-руску, тэлебачанне па-руску?

Дарэчы, пра тэлебачанне. Колькі мы чулі пра новы беларускамоўны канал! Усе абяцанкі аказаліся цынічнай хлуснёй. Можна дзень пры дні раз-пораз уключаць «Беларусь-3» і не сустрэць анічога ні беларускамоўнага, ні наогул беларускага хаця б тэматычна. Затое вас чакаюць здзеклівыя неспадзяванкі. Ідзе мульцік паводле казкі Уладзіміра Караткевіча «Чортаў скарб»: цітры праплылі па-беларуску, а фільм дубляваны на рускую мову...

Але не дачакаюцца. Мова перажыве і цяперашнюю хвалю русіфікацыі.

«НН»: І апошняе. Што б самі пажадалі сабе на гэты дзень нараджэння?

УА: Паспець, пакуль не сустрэнуцца канцы маёй бясконцасці. *(скарочана)*

Гутарыў **Зміцер Панкавец**

КУПЛЯЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ...

«НЯХАЙ ПРАДАЮЦЬ БЕЛАРУСКІЯ ПАНЧОХІ, ШКАРПЭТКІ!»

Пракаповіч лічыць абавязковым выкананне ІП патрабаванняў тэхрэгламенту Мытнага саюза аб бяспецы прадукцыі лёгкай прамысловасці.

"Прадпрымальнікі ўздымаюць пытанне пра гэта тэхрэгламенце, заяўляюць, што па ім немагчыма працаваць. А як можна без элементарных дакументаў прадаваць прадукцыю, якая тычыцца бяспекі жыцця і здароўя чалавека? Калі яны кажуць, што так не могуць працаваць, няхай гандлююць беларускай прадукцыяй, няхай прадаюць беларускія панчохі, шкарпэткі ", - заявіў Пётр Пракаповіч на пасяджэнні Савета па развіцці прадпрымальніцтва, перадае" Інтэрфакс ".

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што ўрад прадаставіў ІП істотныя льготы і камфортныя ўмовы на пераходзе на працу па новых правілах. Акрамя таго, працягнуў ён, сёння ў Беларусі атрымліваюць развіццё не рынкавыя формы гандлю, а буйныя гандлёвыя сеткі.

"Сёння не тая сітуацыя, што была 20 гадоў таму. У нас створаны буйныя гандлёвыя цэнтры, сеткі, і ў наступнай пяцігодцы колькасць гандлёвых плошчаў на душу насельніцтва будзе, як у Еўропе. Калісьці скончыцца час, што людзі будуць ісці за таварамі на рынак ", - сказаў Пракаповіч.

У сувязі з гэтым ён прапанаваў ІП, якія сёння займаюцца гандлем на рынках, "падумаць пра тое, чым займацца далей, ісці ў іншыя сферы - у турызм, аказанне паслуг, вытворчасць".

"Любое аб'яднанне - гэта страта часткі незалежнасці і праца па агульных правілах. Гэта карысць для ўсіх, калі і ў Беларусі, і ў Расіі, і ў Казахстане ёсць адзіныя правілы", - падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

www.charter97.org/ru/news/2013/8/23/74445/

ПЕРШАЯ АСОБА

ПОСЛЕДНЕЕ ПРЕЗИДЕНТСКОЕ ПРЕДУПРЕЖДЕНИЕ. ХРОНИКА

"Больше шальных денег в спорте не будет. Показал результат - получи бешеные деньги. Нет результата - нет денег", - это 18 августа президент чиновнико-спортсменам.

"Нет больше шальных денег. Я говорю это и сельчанам, и промышленникам, и другим. Не потому, что у нас нет денег – денег в стране хватает, но деньги надо зарабатывать. Тогда у нас не будет ни паник, ни катаклизмов, ни кризисов, ни авралов", – а это в сентябре 2011 года и тоже спортсменам.

"Денег шальных больше не будет. В случае достижения хороших результатов - получите еще какую-нибудь премию, результата не достигнете – возвращайте деньги. Я с вас спрошу за результат", - это в мае 2011 года конечно, спортсменам.

"Надо многим готовиться и к тому, я это публично сегодня объявляю, что шальных денег в спорте больше не будет. Только за конкретный результат", - это в августе 2012 года спортсменам же.

"Я не хотел бы, чтобы это совещание превратилось в очередное выбивание денег для спортивных организаций, клубов и спортсменов. Вот это выкиньте сразу из головы, этого не будет", - это в январе 2013 года последнее президентское предупреждение спортс-менам.

И я, вроде, дословно знаю, что президент скажет на следующих пяти спортивных совещаниях....

Помимо спорта "шальных денег" уже много много лет уже не будет у: сельского хозяйства, строителей, учёных, губернаторов и прочих. Особенно у крестьян, да:

• «Никто лишних денег из бюджета не получит», - это сельчанам в апреле 2004-го

• "Больше раздачи денег «огулом» не будет! Ее уже нет, этой раздачи. Я требую это сделать, но за счет производительности труда. Потому что денег уже никто не напечатает", - это им же в ноябре 2006.

• "Проедать деньги больше не будем. Это крестьяне должны себе четко усвоить. И не надо ждать, что мы эти деньги будем раздавать. Лишних денег нет", -- туда же в июле 2007-го.

• "Главный смысл корректировки в том, что шальных денег больше не будет. Никто вваливать в экономику и сельское хозяйство, как прежде, бешеных денег не будет», - тем же сентябрь 2011-го.

• «Шальных денег нет, никто вам деньги со стороны не даст, тем более, не напечатает», - а это уже губернаторам в июне 2012-го.

• "Еще раз подчеркиваю: никаких шальных денег быть не должно. У нас экономика работает нормально, она может себя обеспечивать", - и главе Нацбанка, в июле 2012 года

• «Никаких шальных денег нет и никаких излишеств быть не должно" – снова сельчанам, в апреле 2013-го.

Теперь каждый из вас может составить идеальную президентскую речь по итогам совещания по…. здесь впишите сами. Например так:

"Шальных денег больше не будет. Выкиньте сразу из головы. Деньги надо заработать. Покажите результат – и будут бешеные деньги. Я спрошу за результат." Аминь.

Виктор Малишевский

ДЭМАКРАТЫЧНЫ РУХ

АПАЗІЦЫЯ БУДЗЕ ЎВАЖЛІВА НАЗІРАЦЬ ЗА МЯСЦОВЫМІ ВЫБАРАМІ

Намеснік старшыні Руху "За Свабоду" Юрась Губарэвіч паведаміў БелаПАН, што ў межах кампаніі "За справядлівыя выбары" пяць апазіцыйных арганізацый маюць намер вылучыць 1,5 тысячы назіральнікаў.

Пагадненне аб сумесным назіранні падпісалі Рух "За Свабоду", кампанія "Гавары праўду!", Партыя БНФ, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) і аргкамітэт па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя".

Губарэвіч паведаміў, што ўпершыню кампанія "За справядлівыя выбары" была рэалізавана ў форме міжпартыйнага пагаднення на парламенцкіх выбарах 2008 года, пасля праводзілася на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года і парламенцкіх 2012-га. "У адрозненне ад папярэдніх кампаній на маючых адбыцца мясцовых выбарах асноўны акцэнт было вырашана зрабіць на працы назіральнікаў у тых акругах, дзе ёсць кандыдаты, якія прадстаўляюць структуры, якія падпісалі пагадненне", – сказаў ён.

Губарэвіч таксама паведаміў, што пагадненне аб удзеле ў кампаніі "За справядлівыя выбары" адкрыта для падпісання ўсімі арганізацыямі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі.

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru
Тэл. 8-02139-4-42-52, маб. + 375(29)6723842 (V),
Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 30.08.2013 у 19.25
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.